# НАВУКОВАЕ ЖЫЦЦЁ: РЭЦЭНЗІІ, АНАТАЦЫІ, ВОДГУКІ

## ДАСЛЕДАВАННЕ ПА ГІСТОРЫІ ТУРАЎСКА-ПІНСКАЙ ЕПАРХІІ

**Mironowicz, A. Biskupstwo turowsko-pińskie w XI–XVI wieku / A. Mironowicz. – Białystok : Trans Humana, 2011. – 358 s.**

Прафесар, доктар габілітаваны, загадчык кафедры гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Інстытута гісторыі Універсітэта ў Беластоку Антоній Міpaновіч з'яўляецца аўтарытэтным вучоным па гісторыі Праваслаўнай царквы ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў Польшчы і за яе мяжой. Яму належыць аўтарства 30 манаграфій і больш за 250 артыкулаў па гісторыі праваслаўя. Чарговая яго манаграфія на польскай мове прысвечана гісторыі Тураўска-Пінскай епархіі ў XI–XVI стст.

Кніга складаецца з уступа, сямі раздзелаў і бібліяграфіі. Сярод асаблівасцей выдання трэба адзначыць яго багатую базу крыніц, сярод якіх архіўныя і рукапісныя матэрыялы, друкаваныя выданні з архіваў, бібліятэк Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы. Аўтар спасылаецца на здабыткі як расійскай гістарычнай навукі (дарэвалюцыйнай, савецкай, сучаснай, эміграцыйнай), так і польскай, беларускай (савецкай, сучаснай, эміграцыйнай), украінскай, нямецкай, італьянскай гістарыяграфіі. Неабходна адзначыць: ў працы А. Міpaновіча ўтрымліваецца цэлы шэраг новых высноў.

У першым раздзеле «Праваслаўная царква на рускіх землях у XI–XIII стст.» закранаецца пытанне аб прыняцці і распаўсюджванні хрысціянства. Паводле падлікаў А. Міpaновіча, у XII ст. на старажытнарускіх землях функцыянавала больш за 6 тыс. праваслаўных прыходаў, у тым ліку ў гарадах каля 1 тыс. прыходаў і 700 манастырскіх цэркваў. Пры насельніцтве каля 6 млн. чалавек на 1 прыход прыходзілася прыкладна 1 тыс. чалавек (с. 43).

У другім раздзеле разглядаецца ўзнікненне і гісторыя Тураўскай (Тураўска-Пінскай) епархіі да канца XII ст. Аўтар прыходзіць да смелых высноў. Паводле заключэння А. Міpaновіча, пачаткам Тураўска-Пінскай епархіі трэба лічыць не 1005 г., як гэта запісана ва ўсіх цяперашніх выданнях (гэтую дату ўвялі ў навуковы зварот Я. Галубінскі, Я. Шчапаў, Ю. Лабынцаў і інш.), а 1088 г. Як лічыць А. Міpaновіч, замацаваная раней у гістарыяграфіі дата (1005 г.) была ўзята з 10-й (апошняй) рэдакцыі Кіеўска-Пячэрскага пацерыка, якая перад 1656 г. была зроблена архімандрытам Кіева-Пячэрскай Лаўры Іосіфам Трызнай. Прааналізаваўшы папярэднія рэдакцыі пацерыка, А. Міpaновіч устанавіў, што названай даты (1005 г.) там не было (с. 46–47).

Даследчык робіць выснову аб тым, што паданне аб заснаванні епархіі ў Тураве пры кіеўскім князі Уладзіміры была сфабрыкавана ў пачатку XIV ст. Першым цэнтрам Тураўска-Пінскага княства пры князі Святаполку Уладзіміравічу (Акаянным) быў Пінск («Сказанне аб Барысе і Глебе» пацвярджае яго знаходжанне там у 1015–1019 гг.), а пасля яго разарэння ў 1017–1018 гг. цэнтр быў перанесены ў Тураў. Ці не таму, паводле А. Міpaновіча, наступнае згадванне Пінска ў пісьмовых крыніцах адносіцца толькі да 1097 г. (с. 51)? Значэнне Турава ўзмацнілася пры кіеўскім князі Усеваладзе Яраславічы, калі тураўскі ўдзел атрымаў Святаполк Ізяслававіч. Ускосна факт адсутнасці ўласнай епархіі пры княжанні Святаполка пацвярджаецца прыбыццём і дзейнасцю лацінскага біскупа Рэйнберна, які быў у абозе польскага караля Баляслава Харобрага. Палітычная самастойнасць садзейнічала выхаду тураўскага ўдзелу з-пад юрысдыкцыі ўладзімірскіх епіскапаў і станаўленню самастойнай епархіі.

А. Міpaновіч не пагаджаецца з М. Шэлехавым, аўтарам кнігі пра Давыд-Гарадок (Шэлехаў, М.У. Давыд-Гарадок. Час і людзі / М.У. Шэлехаў. – Брэст : Упр. па друку Брэсц. аблвыканкама, 2000. – 304 с.), што гэты населены пункт быў заснаваны Давы-

дам Ігаравічам, калі ён кіраваў у 1078–1081 гг., бо ў той час у Тураўскім княстве была даволі складаная палітычная сітуацыя (с. 63). Давыд-Гарадок быў заснаваны каля 1100 г.

На думку А. Мірановіча, пра самастойнае Пінскае княства можна гаварыць толькі з 1166 г. Менавіта тады Тураў страціў сваё палітычнае і эканамічнае значэнне і галоўную ролю на Палессі пачаў выконваць Пінск (с. 81). Нягледзячы на тэрытарыяльныя страты, у XII ст. Тураўская епархія перажывала развіццё ўнутранай структуры: закладаліся новыя манастыры і прыходы.

З-за адсутнасці крыніц імёны тураўскіх епіскапаў перыяду 1088–1114 гг. засталіся невядомымі. Першым епіскапам быў манах з Кіева-Пячэрскай Лаўры. Аўтар манаграфіі ўстанавіў імёны і прывёў пэўную інфармацыю пра, магчыма, першых епіскапаў. З 1114 да 1120 г. епіскапскую кафедру ўзначальваў Кірыла (с. 90). Паводле «Слова аб манаху Марціне», пасля Кірыла тураўскімі епіскапамі былі Сімяон і Ігнацій. Першая пацверджаная крыніцамі інфармацыя пра існаванне закладзенай у 1088 г. епархіі ў Тураве адносіцца толькі да 1144 г., калі епіскапам стаў Іаахім (1144–1156 гг.). Менавіта тураўскі епіскап Іаахім у 1147 г. удзельнічаў у саборы епіскапаў, на якім кіеўскім мітрапалітам быў выбраны «русін» Клімент Смаляціч (1147–1156 гг.).

Даволі змястоўная інфармацыя прыведзена пра славутага Кір ылу Тураўскага. Згодна А. Мірановічу, выдатны асветнік нарадзіўся каля 1110 г., памёр перад 1190 г. Дзякуючы добрай хатняй адукацыі Кірыла пазнаёміўся з візантыйскай культурай, агіяграфічнай літаратурай. Вылучаўся сярод іншых сваім красамоўствам, талентам, ведамі і працавітасцю. Пры тураўскім князі Юрыі Яраславічы, прыхільніку аддалення ад Кіева, угаварылі манаха-«стоўпніка» Кірылу ў 1158 г. стаць тураўскім епіскапам. Праўда, у дадатку, ў асобнай табліцы, пачатак епіскапства К. Тураўскага памылкова пазначаны 1175 г. (с. 340). На епіскапскую кафедру Кірыла быў пасвечаны кіеўскім мітрапалітам Канстанцінам (грэкам). «Выбар Кірылы, што паходзіў з мясцовага манастыра, быў нечым выключным, бо большасць ранейшых епіскапаў паходзіла з Кіева-Пячэрскай Лаўры. На такое рашэнне паўплывала не толькі палітыка тураўскага князя, але і слава самога Кірылы як выдатнага тэолага і прамоўцы» (с. 92). Аднак пасля смерці яго пакравіцеляў – мітрапаліта Канстанціна і тураўскага князя Юрыя у 1182 г. Кірыла пакінуў епіскапскую кафедру і перайшоў у мясцовы манастыр Св. Мікалая, а ў апошнія гады – у Барысаглебскі манастыр у Тураве. У манаграфіі таксама прыведзены аргументы на карысць адной з версій пахавання епіскапа Кірылы Тураўскага (памёр каля 1190 г.; у сваю чаргу даследчык А. Мельнікаў лічыць, што гэта адбылося пасля 1190 г.) каля капліцы на могілках Барысаглебскага манастыра ў Тураве.

Аўтарам манаграфіі зроблена спроба ўстанавіць час кананізацыі К. Тураўскага. Паводле меркавання А. Мірановіча, гэта здзейснілася пры пераемніку славутага асветніка на тураўскай епіскапскай кафедры – епіскапе Лаўрэнціі (1182–1194 гг.). Хоць у крыніцах пасля Лаўрэнція (г.зн. з 1194 г.) не пазначаны імёны тураўскіх епіскапаў да 1390 г., аднак даследчык усё-такі здолеў назваць імёны 25 епіскапаў (пераважна без указанняў гадоў іх кіравання).

Трэці раздзел працы прысвечаны стану Тураўска-Пінскай епархіі ў XIII–XV стст. Аўтар дапускае, што першым літоўскім мітрапалітам, імя якога не захавалася ў актах патрыяршага сіноду 1317 г., быў уладыка грэчаскага паходжання. Упершыню імя літоўскага мітрапаліта Феафіла згадана ў 1327 г. (с. 116). Тэрытарыяльная прыналежнасць Тураўска-Пінскага княства да ВКЛ прадвызначыла знаходжанне мясцовай епархіі пад юрысдыкцыяй літоўскіх мітрапалітаў.

У манаграфіі высвятляюцца прычыны арганізацыйнай блытаніны ў царкоўнай структуры XIV ст., на што паўплывалі як геапалітычныя інтарэсы ВКЛ, Польшчы, Рускай дзяржавы, так і імкненні галіцкіх, кіеўска-маскоўскіх, літоўскіх мітрапалітаў пашырыць свой уплыў. Гэта прывяло да змены не толькі статусу Тураўска-Пінскай епар-

хіі, але і яе тэрыторыі. У другой палове XV ст. у яе ўваходзілі пераважна землі Тураўскага, Пінскага, Гарадзецкага і Дубровіцкага княстваў (с. 137).

У чацвёртым раздзеле разгледжана рэлігійнае і культурнае жыццё ў Тураўскай епархіі да канца XV ст. Аналізуючы шматлікія помнікі матэрыяльнай культуры Тураўскага княства, аўтар прыходзіць да высновы, што яго жыхары прынялі хрысціянскую рэлігію на працягу XI ст. (с. 156). У гэтай частцы манаграфіі прааналізаваны ход царкоўнага будаўніцтва ў Тураве і Пінску, расказваецца пра ікону Маці Боскай Купяцікай, разлядаецца творчасць К. Тураўскага, «Слова аб манаху Марціне» і іншыя значныя творы, асобы. Разам з Туравам у XII ст. цэнтрам летапісання быў і Пінск. Таксама зроблена выснова аб тым, што менавіта старажытнаруская іканаграфія нарадзілася ў часы кіеўскіх мітрапалітаў Кіпрыяна і Грыгорыя Цамблакаў. Аўтар падкрэслівае значны ўклад выхадцаў Тураўска-Пінскай епархіі ў станаўленне Супрасльскага манастыра. Васіліса, сястра пінскага князя Фёдара Яраславіча, была жонкай берасцейскага старасты, навагародскага ваяводы, маршалка ВКЛ Аляксандра Хадкевіча, які аказваў матэрыяльную падтрымку пры ўзвядзенні Дабравешчанскай царквы Супрасльскага манастыра, апекавалася выхадцамі з Піншчыны. Паводле А. Мірановіча, Багдан Анісімавіч з Пінска рэдагаваў шэдэўр праваслаўнай музычнай культуры – «Супрасльскі ірмалагіён».

Пяты раздзел працы прысвечаны гісторыі Тураўска-Пінскай епархіі ў XVI ст. На падставе архіўных крыніц і апублікаваных матэрыялаў XIX–XX стст. праведзена рэканструкцыя арганізацыйнай структуры Тураўска-Пінскай епархіі – выдзелены 12 благачынняў: Пінскае, Драгічынскае (Давячоравічы), Бездзежскае, Лагішынскае, Любяшоўскае, Нобельскае, Пагостскае, Столінскае, Гарадзецкае (Давыд-Гарадок), Тураўскае, Петрыкаўскае, Дубровіцкае (с. 222). У самім Пінску ў сярэдзіне XVI ст. было 16 цэркваў, 2 манастыры: жаночы Варварынскі і мужчынскі Лешчанскі. Прасочваецца гісторыя ўсіх гэтых праваслаўных святынь (с. 224–239). Таксама асвятляецца гісторыя цэркваў па ўсіх благачыннях епархіі.

У шостым раздзеле зроблены аналіз дзейнасці манастыроў на тэрыторыі Тураўска-Пінскай епархіі. Даследчык паставіў пад сумненне сцвярджэнні некаторых гісторыкаў (у прыватнасці, А. Мілавідава), што ў 1420 г. на тэрыторыі епархіі, якая да таго часу значна зменшылася, было 49 манастыроў. А. Мірановічам прыведзены дакументальна пацверджаныя звесткі пра 14 манастыроў у Пінску, Тураве, Петрыкаве, Купяцічах, Здзітаве, Клецку і іншых населеных пунктах.

У заключным, сёмым раздзеле манаграфіі прааналізавана становішча Тураўска-Пінскай епархіі ў канцы XVI ст., раскрыта яе значэнне ў гісторыі Праваслаўнай царквы ў складзе Рэчы Паспалітай. У выніку аналізу канфесійнага становішча пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што ў першыя гады пасля яе заключэння большая частка епархіі заставалася праваслаўнай. Хоць тураўска-пінскі епіскап Іаан Гогаль далучыўся да уніі, але яго падтрымала толькі невялікая частка духавенства. Супраць уніяцтва выступіла большая частка духавенства, асабліва з праваслаўных манастыроў (Лешчанскага манастыра ў Пінску і іншых). Актыўную антыўніяцкую пазіцыю заняло духавенства тых прыходаў, якія знаходзіліся ва ўладаннях праваслаўных магнатаў Алелькавічаў, Астрожскіх ці кальвіністаў Радзівілаў. Падзелы ў асяроддзі ніжэйшага духавенства былі звязаны з канфесійнай прыхільнасцю землеўладальнікаў: супраць уніі выступіла палеская праваслаўная шляхта, мяшчанства, прадстаўнікі царкоўных брацтваў. Сялянства не мела акрэсленай пазіцыі адносна уніі. Аўтар манаграфіі падтрымлівае іншых даследчыкаў адносна таго, што кансерватызм і рэлігійная індэферэнтнасць сялянства была вынікам уплыву ладу і светапогляду шляхецкіх слаёў (с. 279).

Як справядліва лічыць А. Мірановіч, ацэнка ролі Тураўска-Пінскай епархіі неабходна для разумення канфесійнай і этнакультурнай тоеснасці беларускага народа.

«Ніяк нельга ўявіць гісторыю беларускай культуры без спадчыны Кірылы Тураўскага, культу Купяціцкай іконы, укладу ў культурна-рэлігійную спадчыну Лешчанскага манастыра, спевакоў і іканапісцаў з Пінска і Турава ці дзейнасці такіх фігур, як Фёдар Іванавіч Яраславіч, Сямён Алелькавіч і Канстанцін Астрожскі» (с. 284).

Практычную значнасць маюць дадаткі манаграфіі: табліцы са спісамі кіеўскіх мітрапалітаў з указаннем гадоў кіравання за перыяд з 988 да 1596 г., львоўскіх мітрапалітаў (1317–1347, 1350–1435 гг.), галіцкіх мітрапалітаў (1303–1331 і 1371–1391 гг.). Асабліва каштоўным падаецца прыведзены спіс тураўска-пінскіх епіскапаў (1088–1596 гг.), а таксама тураўскіх князёў X–XII стст. У табліцы «Прыходская структура Тураўска-Пінскай епархіі ў канцы XVI ст.» прыведзены звесткі па кожным благачынні. Каб чытачу было зручней знайсці ў тэксце згадкі пра пэўную асобу ці мястэчка, прыведзены асабовы і геаграфічны паказальнікі.

Трэба падкрэсліць важную рысу даследавання прафесара А. Мірановіча, аб чым узгадаў на вокладцы кнігі мітрапаліт Польскай Праваслаўнай царквы Сава: аб’ектыўнасць, нейтральнасць пры разглядзе праблем, спрэчных і далікатных з рэлігійнага пункту гледжання. Дарэчы, сам аўтар не лічыць сваю манаграфію поўным выкладам гісторыі Тураўска-Пінскай епархіі XI–XVI стст., але пераканаfamy ў тым, што яна будзе спрыяць далейшым даследаванням (с. 14). Мяркуем, што дадзенае наватарскае навуковае даследаванне па гісторыі адной са старажытных праваслаўных епархій заслугоўвае пільнай увагі з боку як свецкіх даследчыкаў (гісторыкаў, культуролагаў), выкладчыкаў, студэнтаў, так і свяшчэннаслужыцеляў.

***Вабішчэвіч А.М.****, доктар гістарычных навук,*
*загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*